РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**ХІХІТУ́Н**, нячысцік, які знаходзіцца ў чалавека за спінаю. Калі з чалавекам ці з блізкімі яму людзьмі павінна здарыцца нешта нядобрае, Х. пачынае радавацца гэтаму, смеючыся тоненька і часта: «Хі-хі, хі-хі, хі-хі...». Калі ў гэты момант рэзка абярнуцца назад, можна ўбачыць маленькае стварэнне, знешне падобнае на малпачку, але з невялічкімі рожкамі на макаўцы. Лічылася, што ўспрыняўшы здзеклівы смех Х. як перасцярогу, нярэдка можна прадухіліць бяду.

*Літ.*: Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 3. Зямная дарога ў вырай. Мн., 1999. С. 582.

*У. А. Васілевіч.*



*Хіхітун.*